Источник: "Мінская праўда" - 2013-07-25

# СУСЕДЗІ




Брэстчына

## Пад забаронай

У Брэсцкай вобласці можа быць забаронена рэалізацыя спіртных напояў у начны час. З адпаведнай ініцыятывай выступілі праваахоўныя органы. Зараз у рэгіёне гэтую прадукцыю кругласутачна прапаноўваюць 33 крамы і 2 гандлёвыя кропкі, якія размешчаны на аўтазаправачных станцыях.

Віцебшчына

## Эфект фіштэрапіі



У Віцебскім абласным клінічным скурна-венералагічным дыспансеры можна запісацца на фіштэрапію. Для ўкаранення новай працэдуры медустанова набыла стайку з больш чым 200 рыбак гара руфа сямейства карпавых. Рыбкі мякка ачышчаюць скуру ад нежывога паверхневага слою клетак.

Гомельшчына

## Заблукаў пенсіянер

Каля паўтара сутак правёў у лесе 73-гадовы жыхар Нараўлянскага раёна, які пайшоў збіраць ягады. Адшукалі яго пасля звароту родных, у шпіталізацыі ён патрэбы не меў.

Гродзеншчына

## Купал і крыж



У Гродне ўстанавілі купал і крыж на храме Усекнавення главы Іаана Прадцечы. Храм узводзіцца ў адным з мікрараёнаў абласнога цэнтра.

Магілёўшчына

## Алея сталіц

Да Дня беларускага пісьменства (свята, як вядома, пройдзе цягам 30 жніўня—1 верасня) у Быхаве з'явіцца алея сталіц фэсту. Праграма будзе вельмі насычанай. Да свята ў горадзе будзе рэканструяваны шэраг аб'ектаў.

Мінск

## Новы аб'ект



У Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці адбылася прэзентацыя новага экспаната. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі перадала сюды макет айчыннага касмічнага апарата.

**Падрыхтавана па матэрыялах БелТА.**